УДК 94(476):27

# ДА ПЫТАННЯ АБ ВЫХАВАЎЧАЙ РОЛІ РЭЛІГІІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД СЯРЭДНЯВЕЧЧА

**Шчэрбін Марына Міхайлаўна,**
Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна
(г. Мазыр, Беларусь)

*У артыкуле разглядаецца значнасць рэлігіі і яе ўплыў на развіццё выхаваўчых ідэй на беларускіх землях у перыяд Сярэднявечча. Раскрыта важная роля рэлігійна-этычнай прасторы ў фарміраванні асобы, падтрыманні грамадскай згоды і наладжванні дыялогу ў межах полікультурнай і поліканфесійнай супольнасці.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Духоўна-светапогляднае яднанне народа на беларускіх землях гістарычна забяспечвала рэлігія, якая дэтэрмінавала і агульнасць каштоўнасных арыенціраў, і замацаванасць традыцыйных форм светаўспрымання, і прынцыпы будаўніцтва адносін паміж асобай і соцыўмам. Гэта дае падставы сцвярждаць, што ў перыяд Сярэднявечча існавала пэўная рэлігійна-этычная прастора, якая абапіралася на спалучэнне рэлігійна-філасофскіх ідэй з народна-педагагічнымі традыцыямі. Яна выступала тым выхаваўчым асяроддзем, у межах якога адбывалася не толькі перадача сацыяльнага вопыту, але і фарміраванне чалавека запатрабаванага часам і абставінамі быцця канкрэтнага грамадства.

На думку даследчыкаў, менавіта хрысціянства як адзіная рэлігія нашых продкаў шмат у чым садзейнічала таму, што ўяўленні аб Радзіме "перарастаюць межы сялянскай абшчыны і нават княства, пашыраючыся да зямлі-краіны" [1, с. 179]. З рэлігійным аднадумствам атаясамлівалася патрыятычная ідэя аб'яднання, абароны супраць знешняй пагрозы як першасных умоў існавання народа і краіны. У якасці аднаго з самых цяжкіх выпрабаванняў для чалавека гістарычныя крыніцы, што апелявалі да хрысціянскай этыкі, адзначалі быць "пришельцами в земле не своей", падкрэсліваючы важную ролю Радзімы ў жыцці асобы [4, с. 108].

Прынцыпам хрысціянскага светаразумення адпавядала асаблівая ўвага беларусаў да ўзаемаадносін чалавека з соцыумам, у аснове якіх павінна быць агульнае дабро. У плюралістычным грамадстве ВКЛ пошук кампрамісу абапіраўся на неабходнасць фарміравання асобы з пэўным наборам альтруістычна-гуманістычных якасцей з яскрава выражанай хрысціянскай накіраванасцю. Сярод такіх якасцей служэнне сваёй зямной Айчыне прызнавалася адной з найважнейшых дабрачыннасцей і важнай маральнай рысай чалавека. Актыўная грамадская дзейнасць, вайсковая служба, абарона дзяржаўных інтарэсаў – прызнаваліся царквой праяўленнямі адданасці грамадству, краіне, Богу. Гераізм і самаахвяраванне суседнічалі з міласэрнасцю, клопатам пра іншых і не ўтрымлівалі нянавісці ці пачуцця перавагі над іншымі людзьмі. Гэта спрыяла фарміраванню міралюбівасці, згоды, чуллівасці, абумовіла прыярытэт дыялогу і супрацоўніцтва як запатрабаваных асобасных якасцей у нашых продкаў. Па гэтай жа прычыне рэлігійна-асветніцкая і дабрачынная дзейнасць з'яўляліся найлепшым увасабленнем рэалізацыі хрысціянскіх запаведзяў, а жыццё хрысціяніна разглядалася як выкананне свайго маральнага абавязку. Такія перакананні садзейнічалі прывучэнню чалавека да справядлівага быцця сярод іншых людзей, выступалі гарантам устойлівых грамадскіх адносін.

Ядром этыка-гуманістычных поглядаў, атрымаўшых падтрымку ў шырокіх грамадскіх колах, з'яўлялася хрысціянская аксіёма: *"Итак во всем, как хотите, чтобы с вами поступали люди, так и вы с ними ибо в этом закон и пророки"* (Евангелие от Матфея, 7:12) [2, с. 21]. Нават пашырэнне гуманістычных ідэй на беларускіх землях, на думку даследчыкаў, адбывалася ў "спалучэнні з традыцыйнымі праваслаўнымі дамінантамі беларускай культуры" (У.М. Конан, С.А. Падокшын, А.С. Майхровіч) [3, с. 102]. Гэта садзейнічала развіццю гуманістычна арыентаваных нацыянальных пачуццяў, абумовіла запатрабаванасць агульнага дабра і згоды як важных грамадскіх здабыткаў на беларускіх землях. Адсюль глыбокае перакананне адзінства веры, чалавекалюбства і



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

імкнення быць карысным вызначыла накіраванасць шляхоў удасканалення чалавека і грамадства.

Такім чынам, выхаваўчую ролю рэлігію на беларускіх землях у перыяд Сярэднявечча цяжка пераацаніць. Менавіта абумоўленае рэлігіяй ментальна-светапогляднае аднадумства выступала ў якасці крыніцы выхаваўчых ідэй, з'яўлялася сродкам сацыялізацыі асобы, разглядалася гарантам упарадкаванасці грамадскага жыцця.

## Літаратура

1. Забияко, А.П. История дрревнерусской культуры : учеб. пособие для средних художественных учебных заведений и профильных школ / А.П. Забияко. – М. : Интерпракс, 1995. – 304 с.

2. История общественной и философской мысли в Беларуси: эпоха Средневековья: хрестоматия : пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев : УО "МГУ им. А.А. Кулешова", 2009. – 396 с.

3. Конан, В.М. Становление и развитие философской мысли в X–XVII вв. / В.М. Конан, А.С. Майхрович, С.А. Подокшин // Очерки истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX в. / П.Т. Петриков [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1996. – С. 98–116.

4. Слово о законе и благодати Иллариона, митрополита Киевского // Златоструй: Древняя Русь X–XIII веков / сост., авт. текст, коммент. А.Г. Кузьмина, А.Ю. Карпова. – М., 1990. – С. 106–121.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова